*Святлана Талмачова*

# ДЗЕЙНАСЦЬ ГУБЕРНСКІХ ПРЫСУТНАСЦЕЙ ПА РЭАЛІЗАЦЫІ ЎРАДАВАЙ АГРАРНАЙ ПАЛІТЫКІ НА ТЭРЫТОРЫІ БЕЛАРУСІ (1901–1914 ГГ.)

Аграрнае пытанне было адным з найбольш важных у другой палове XIX – пачатку XX ст. Яго канчатковая нявырашанасць стала адной з прычын Першай расійскай рэвалюцыі. Адмена прыгоннага ладу 19 лютага 1861 г., а затым больш познія законы аб пазямельным уладкаванні розных катэгорый сельскага насельніцтва рэалізаваліся мясцовымі органамі кіравання сялянамі. Да іх адносіліся губернскія па сялянскіх справах прысутнасці, міравыя пасрэднікі і іх павятовыя з’езды, а з 1878 г. у Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях – павятовыя па сялянскіх справах прысутнасці.

Губернскія прысутнасці сталі правапераемнікамі губернскіх па сялянскіх справах прысутнасцей, ліквідаваных «Положением о земских участковых начальниках» ад 12 ліпеня 1889 г. У адпаведнасці з ім губернскую прысутнасць узначальваў губернатар. У яе склад уваходзілі губернскі прадвадзіцель дваранства, віцэ-губернатар, пракурор акруговага суда і 2 неадменныя члены. Акрамя названых асоб, на пасяджэнне губернскай прысутнасці на правах яго членаў запрашаліся: старшыня або член акруговага суда, кіраўнікі казённай палаты і дзяржаўнымі маёмасцямі, а таксама старшыня губернскай земскай управы, калі разглядаемыя пытанні адносіліся да іх кампетэнцыі (арт. 105)[1].

1 Полное собрание законов Российской империи (далей – ПСЗРИ). Собр. 3-е. Т. 9 (1889). Отд. I. № 6196. – С. 508–535; Отд. II. К № 6196. – С. 521.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Заканадаўства ад 12 ліпеня 1889 г. у беларускіх губернях было пашырана толькі ў пачатку XX ст. і распаўсюджвалася яно паэтапна. 12 чэрвеня 1900 г. быў падпісаны ўказ, у адпаведнасці з якім з 1 студзеня 1901 г. Палажэнне ад 12 ліпеня 1889 г. уводзілася ў Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях[2]. Рэальна ж новыя ўстановы былі ўведзены тут толькі ў канцы 1901 г. В ўказе Мікалая II ад 17 ліпеня 1900 г. адзначалася, што «вследствие происходящих на востоке событий, ныне же принять по всем ведомствам настоятельные меры к уменьшению расходов, не только не испрашивая никаких сверхсметных ассигнований, но и сокращая издержки на потребности, хотя и предвиденные по сметам и к производству разрешенные, но могущие быть отложенными»[3]. У сувязі з гэтым 27 ліпеня 1900 г. міністр фінансаў у афіцыйным паведамленні міністру ўнутраных спраў адзначыў неабходнасць адтэрміноўкі ўвядзення новых устаноў у названых трох губернях не менш чым на адзін год, паколькі «настоящий порядок заведывания этими учреждениями, действующий в течение столь продолжительного срока, может быть продолжен на некоторое время»[4]. 14 жніўня 1900 г. старшыня Дэпартамента дзяржаўнай эканоміі Дзяржаўнага савета Д. М. Сольскі, міністр фінансаў С. Ю. Вітэ і таварыш дзяржаўнага кантралёра А. П. Вашчанкаў прадставілі даклад імператару, у якім прапанавалася адтэрміноўка меркаванага раней рэфармавання[5].

Аднак міністр унутраных спраў лічыў мэтазгодным увядзенне новых устаноў у названых трох губернях не пазней, чым з 1 ліпеня 1901 г. Ён апасаўся, што адтэрміноўка рэформы зацягне ўвядзенне тут «Положения о порядке взимания окладных сборов с надельных земель сельских обществ» ад 23 чэрвеня 1899 г.,

---

2 ПСЗРИ. Собр. 3-е. Т. 20 (1900). Отд. I. № 18864. – С. 762–764.

3 Расійскі дзяржаўны гістарычны архіў (далей – РДГА). Ф. 1291. Воп. 54, 1900 г. Спр. 229. Арк. 1.

4 РДГА. Ф. 1291. Воп. 54, 1900 г. Спр. 229. Арк. 2–3 адв.

5 РДГА. Ф. 1291. Воп. 54, 1900 г. Спр. 229. Арк. 1–1 адв.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

якое дзейнічала толькі ў тых губернях, дзе існавалі земскія начальнікі ці міравыя пасрэднікі[6]. Ён адзначаў, што «скорейшее принятие мер по упорядочению взимания окладных сборов составляет вопрос первостепенной важности; всякая продолжительная отсрочка его разрешения невыгодно отзовется на интересах сельского населения и государства»[7]. Адзначым, што з 1861 г. адказнасць за спагнанне падаткаў ускладалася на міравых пасрэднікаў, а з рэфармаваннем мясцовых устаноў у 1878 г. па ўзору 1874 г., гэтыя абавязкі перадаваліся павятовым спраўнікам, якія былі абцяжараны і іншымі справамі. Таму ў большасці выпадкаў адказнасць за спагнанне акладных збораў перадавалася ў рукі ніжэйшых паліцэйскіх чыноў — становых прыставаў і наватураднікаў, якія былі зацікаўлены пераважна толькі ў фармальным выкананні каштарысаў. Міністр юстыцыі М. В. Мураўёў падтрымаў меркаванні міністра ўнутраных спраў[8]. Такая пазіцыя сведчыць аб важнасці губернскіх прысутнасцей у структуры мясцовага кіравання для рэалізацыі ўнутранай, у тым ліку і аграрнай, палітыкі дзяржавы.

Затым прапановы Дзяржаўнага савета паступілі да Мікалая II, які іх зацвердзіў 4 студзеня 1901 г. У адпаведнасці з імі прапанавалася распаўсюдзіць дзеянне закона ад 12 чэрвеня 1889 г. на Віцебскую, Магілёўскую і Мінскую губерні не ў першым паўгоддзі, а ў апошняй чвэрці 1901 г.[9] 1 кастрычніка 1901 г. новыя ўстановы, створаныя на падставе законаў ад 12 ліпеня 1889 г. і 12 чэрвеня 1900 г., былі адкрыты ў Віцебскай губерні[10],

---

6 ПСЗРИ. Собр. 3-е. Т. 19 (1899). Отд. I. № 17286. — С. 804–815.

7 РДГА. Ф. 1291. Воп. 54, 1900 г. Спр. 229. Арк. 2, 4–4 адв.

8 РДГА. Ф. 1291. Воп. 54, 1900 г. Спр. 229. Арк. 3 адв. — 4, 31.

9 ПСЗРИ. Собр. 3-е. Т. 21. 1901. Отд. I. № 19530. — С. 8.

10 *Арапов, А. В.* Краткий исторический очерк крестьянского вопроса и деятельности крестьянских учреждений Витебской губернии со дня обнародования высочайшего манифеста 19-го февраля 1861 года и до наших дней: (50-летие) / А. В. Арапов. — Витебск, 1911. — С. 52; РДГА. Зала для чытання. Калекцыя «Отчеты губернаторов». Спр. 121. Ч. 1. Арк. 48 адв.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

а ў Магілёўскай і Мінскай губернях — з 1 лістапада 1901 г.[11]

Галоўным у дзейнасці губернскіх прысутнасцей было менавіта кіраванне «сялянскай справай», у тым ліку пазямельным уладкаваннем сельскага насельніцтва. Гэты аспект адносіўся да адміністрацыйнай дзейнасці органаў мясцовага кіравання. На ўтрыманне Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернскіх прысутнасцей з 1901 г. выдаткоўвалася па 31 500 руб. штогод, а на «усиление канцелярских средств» у іх — 6 000 руб. штогод. Адзначым, што Палажэннем 12 ліпеня 1889 г. на «канцелярские и хозяйственные расходы» кожнай губернскай прысутнасці прадугледжвалася па 4 000 руб. штогод[12]. Дадатковае фінансаванне было звязана з вялікай колькасцю пазямельных спраў у беларускіх губернях. Асобна вызначалася сума на ўтрыманне двух паверачных землямераў пры губернскіх прысутнасцях: Віцебскай — 1 000 руб. і Мінскай — 1 600 руб. штогод. У Магілёўскай губ. такія пасады не ўводзіліся. Магчыма, гэта было звязана з тым, што тут не праводзілася абавязковае адмежаванне сялянскіх і памешчыцкіх зямель у адпаведнасці з правіламі ад 26 сакавіка 1869 г.[13] Акрамя таго, у распараджэнне міністра ўнутраных спраў выдаткоўваліся 19 400 руб. на межавыя работы пры пазямельным уладкаванні сельскіх абывацелей у Віцебскай, Магілёўскай і Мінскай губернях. У законе асобна вызначалася, што на справы, звязаныя з пазямельным уладкаваннем сельскіх вечных чыншавікоў, міністрам ўнутраных спраў штогод размяркоўвалася 6 100 руб. паміж губернскімі і павятовымі прысутнасцямі трох названых губерняў[14].

---

[11] РДГА. Зала для чытання. Калекцыя «Отчеты губернаторов». Спр. 121. Ч. 1. Арк. 151 адв.; Спр. 122. Ч. 2. Арк. 76–77.

[12] ПСЗРИ. Собр. 3-е. Т. 9 (1889). Отд. I. № 6196. – С. 508–535; Отд. II. К № 6196. – С. 249.

[13] ПСЗРИ. Собр. 2-е. Т. 44 (1869). Отд. I. № 46901. – С. 272–275.

[14] ПСЗРИ. Собр. 3-е. Т. 20 (1900). Отд. I. № 18854. – С. 763–764.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

У Віленскай і Гродзенскай губернях установы па ўзоры 12 ліпеня 1889 г. былі створаны ў адпаведнасці з законам ад 8 чэрвеня 1903 г.[15] Віленская і Гродзенская губернскія прысутнасці пачалі сваю дзейнасць з 1 снежня 1903 г.[16] Законам асобна адзначаўся абавязак па пазямельным уладкаванні былых вольных людзей другога разраду, а таксама разбор магчымых спрэчак паміж імі і землеўладальнікамі (ч. III, арт. 3).

Пасяджэнні губернскай прысутнасці звычайна праходзілі 1 раз у тыдзень. Напрыклад, пасяджэнні Мінскай губернскай прысутнасці прызначаліся па аўторках[17], у Магілёўскай губернскай прысутнасці ў 1910 г. пасяджэнні адбываліся таксама па аўторках, а з 1912 г. — па панядзелках, і праз тыдзень вырашаліся адміністрацыйныя і судовыя справы[18]. У Гродзенскай губ. у 1913 г. пасяджэнні прызначаліся па пятніцах, а па суботах губернатар заслухоўваў даклады неадменных членаў прысутнасці[19]. Аналагічна была наладжана справа і ў Віленскай і Віцебскай губернях. Расклад пасяджэнняў узгадняўся з губернатарам, які з'яўляўся старшынёй практычна ўсіх губернскіх камітэтаў і прысутнасцей.

«Галоўнай рабочай сілай» губернскай прысутнасці былі яе неадменныя члены. Яны вылучаліся з мясцовых дваран губернатарам пры ўзгадненні з губернскім прадвадзіцелем дваранства. Прэтэндэнты на пасаду павінны былі праслужыць у губерні не менш трох гадоў у якасці прадвадзіцеля дваранства, неадменнага члена губернскай ці павятовай па сялянскіх

---

[15] ПСЗРИ. Собр. 3-е. Т. 23 (1903). Отд. I. № 23106. — С. 687–689; Отд. II. — С. 356–359.

[16] Обзор Виленской губернии за 1903 год. — Вильна, 1904. — С. 89.

[17] Памятная книжка Минской губернии на 1906 год. — Минск, 1905. — С. 50; Памятная книжка Минской губернии на 1914 год. — Минск, 1913. — С. 50.

[18] Памятная книжка Могилевской губернии на 1910 год. — Могилев губернский, 1910. Ч. III. — С. 65; Памятная книжка Могилевской губернии на 1912 год. — Могилев губернский, 1912. Ч. III. — С. LXXIV.

[19] Адрес-календарь и Памятная книжка Гродненской губернии на 1913 год. — Гродна, 1912. Ч. III. — С. 2–3.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

справах прысутнасці, міравога суддзі або земскага начальніка. Канчатковае прызначэнне неадменных членаў зацвярджалася імператарам па хадайніцтве міністра ўнутраных спраў. На неадменных членаў прысутнасці, акрамя падрыхтоўкі дакладаў, ускладаўся кантроль за правільным вядзеннем справаводства і выкананнем розных даручэнняў прысутнасці. Губернская прысутнасць мела сваю канцылярыю, якую ўзначальваў прызначаны губернатарам сакратар.

Важнай істотнай асаблівасцю кадравага складу губернскіх прысутнасцей Беларусі было існаванне ў штаце трох неадменных членаў, замест двух, прадугледжаных Палажэннем 1889 г. Звязана гэта было менавіта з вялікай колькасцю і складанасцю спраў па пазямельным уладкаванні розных катэгорый сельскага насельніцтва, якіх не існавала ў іншых губернях Расійскай імперыі. У некаторых выпадках у склад губернскай прысутнасці на правах неадменных членаў дадаткова ўводзіліся чыноўнікі пэўных міністэрстваў. Напрыклад, у склад Магілёўскай прысутнасці ўваходзіў член па справах перасялення, чыноўнік Перасяленчага ўпраўлення МУС[20]. У склад Віленскай губернскай прысутнасці ў 1908 г. быў прызначаны чыноўнік асобых даручэнняў Галоўнага ўпраўлення землеўладкавання і земляробства для выканання абавязкаў неадменнага члена па справах землеўладкавання[21].

Неадменныя члены з'яўляліся дакладчыкамі губернатару і губернскай прысутнасці, неслі адказнасць за рэалізацыю новых законаў ў сферы сялянскага землеўладання і кіраван

[20] Памятная книжка Могилевской губернии на 1902 год. – Могилев, 1902. – С. 16.

[21] Навукова-даведачная бібліятэка РДГА (далей – НДБ РДГА). Друкаваная запіска (далей – ДЗ) 14926. Краткий обзор десятилетней деятельности крестьянских учреждений Виленской губернии, преобразованных по закону 12 июля 1889 года (1.12.1903 – 1.12.1913). – Вильна, 1913. – С. 25; Памятная книжка Виленской губернии на 1909 год. – Вильна, 1909. Отд. I. – С. 8.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

назіраннем за мясцовымі сялянскімі ўстановамі і ў цэлым правядзеннем аграрных мерапрыемстваў на месцах. Неадменныя члены рыхтавалі да вырашэння ўсе справы, якія паступалі на разгляд губернскай прысутнасці як вышэйшай інстанцыі па сялянскіх справах у губерні. У 1907 г. міністр унутраных спраў П. А. Сталыпін на адкрыцці з'езда неадменных членаў губернскіх прысутнасцей вызначыў іх месца і ролю ў мясцовым кіраванні і ў рэалізацыі аграрнай палітыкі дзяржавы: «Губернские присутствия — это нервный центр губернии, объединяющий все власти, близко соприкасающиеся с крестьянами. В настоящее время главная задача губернских присутствий — это направлять деятельность земских начальников»[22]. Адначасова гэтыя чыноўнікі, па словах новага міністра унутраных спраў М. А. Маклакова (у 1912 г.), з'яўляліся «ближайшими руководителями и непосредственными инструкторами», праз якіх прысутнасць, як орган назірання, ажыццяўляла кантроль, кіраўніцтва і каардынацыю дзейнасці падпарадкаваных ёй установ і асоб у адпаведнасці з патрабаваннямі ўрадавай палітыкі. Гэтыя ўмовы прывялі да таго, што ў пачатку XX ст. неадменныя члены прысутнасці пад кіраўніцтвам губернатара з'яўляліся «фактически главными направляющими силами в областях — общественного управления крестьянского населения, местного правосудия, обеспечения населения продовольствием и, наконец, главное, в деле проведения в жизнь новейших узаконений в сфере крестьянского землевладения»[23].

Колькасць абавязкаў губернскіх прысутнасцей павялічвалася разам з развіццём заканадаўства адносна сельскага насельніцтва. Значна ўзрасло канцылярскае справаводства, што характарызуе знешні бок аб'ёмаў іх працы. Напрыклад, у цэлым па імперыі гэтыя паказчыкі з 1893 па 1910 г. значна ўзра-

[22] Труды Съезда непременных членов губернских присутствий. 24 октября — 1 ноября 1907 г. — Санкт-Петербург, 1908. — С. 4.

[23] РДГА. Ф. 1278. Воп. 2. Спр. 2057. Арк. 3 адв.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

слі: уваходных папер — у 2,6 раза: з 387 138 у 1893 г. да 991 859 у 1910 г.; зыходных — таксама ў 2,6 раза, адпаведна з 368 330 да 959 060; судовых — з 41 818 да 141 516 (у 3,4 раза); адміністрацыйных у 1893 г. было 49 300, а ў 1910 г. — 109 075 спраў (у 2,2 раза)[24] (табл. 1).

У беларускіх губернях аб'ёмы справаводства былі значна большымі, чым сярэднія паказчыкі па 43 губернях. Дарэчы, даныя МУС па заходніх губернях, уключаныя ў паказчыкі за 1893 г., прыводзіліся па поўных гадах з увядзення Палажэння 1889 г. — за 1902 г. па Віцебскай, Мінскай і Магілёўскай губернях і за 1904 г. — па Віленскай і Гродзенскай (табл. 1). У пяці губернскіх прысутнасцях Беларусі аб'ёмы справаводства

***Табліца 1* — Справаводства ў губернскіх прысутнасцях (1902/1904 і 1910 гг.)[25]**

| Губернскія прысутнасці | Уваходныя паперы | | Зыходныя паперы | |
|---|---|---|---|---|
| | 1902/1904 г. | 1910 г. | 1902/1904 г. | 1910 г. |
| Віленская (1904) | 20977 | 47165 | 18887 | 40641 |
| Віцебская (1902) | 16116 | 19249 | 16740 | 17885 |
| Гродзенская (1904) | 15471 | 29025 | 14333 | 27267 |
| Мінская (1902) | 23345 | 30848 | 20279 | 33274 |
| Магілёўская (1902) | 28993 | 28835 | 26794 | 25272 |
| Усяго ў 5 губернях | 104902 | 155122 | 97033 | 144339 |
| Усяго ў 43 губернях (1893 г.) | 387138 | 991859 | 368330 | 9 59060 |
| У сярэднім у адной губернскай прысутнасці ў 43 губернях (1893 г.) | 9003,2 | 23066,5 | 8565,8 | 22303,7 |
| У сярэднім у адной губернскай прысутнасці ў 5 заходніх губернях | 20980,4 | 31024,4 | 19406,6 | 28867,8 |
| Суадносіны аб'ёму справаводства ў 5 заходніх і ў 43 губернях імперыі (%) | 233,0 | 134,5 | 226,6 | 129,4 |

[24] РДГА. Ф. 1278. Воп. 2. Спр. 2057. Арк. 9–11.

[25] Складзена і падлічана па: РДГА. Ф. 1278. Воп. 2. Спр. 2057. Арк. 9–11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

з 1902/1904 г. да 1910 г. таксама значна ўзраслі: уваходных папер — з 104 902 да 155 122, а зыходных — з 97 033 да 144 336 дакументаў адпаведна. Пры гэтым пры параўнанні даных за 1910 г. адзначым, што аб'ём справаводства ў сярэднім у кожнай прысутнасці 5 беларускіх губернях быў большы, чым у сярэднім па 43 губернях: выходных папер — на 34,5 %, а зыходных — на 29,4 %[26] (табл. 1), што сведчыць аб іх большай загружанасці. Параўноўваць даныя за 1902/1904 г. з данымі за 1893 г., якія прыведзены ў звестках МУС, мы лічым не зусім карэктным, таму што, як адзначалася вышэй, за гэты час на губернскія прысутнасці былі ўскладзены новыя абавязкі, якіх яшчэ не было ў 1893 г.

Уражвае і павелічэнне колькасці судовых і адміністрацыйных спраў, якія паступалі на разгляд губернскіх прысутнасцей (табл. 2). Калі разглядаць сярэднія лічбы, то беларускія губерні мелі аднолькавы паказчык росту судовых спраў — у 3,4 раза (41 818 — у 1893 г. і 141 516 — у 1910 г. у 43 губернях і з 7 047 у 1902/1904 г. да 24 128 — у 1910 г. у 5 паўночна-заходніх). Аднак калі ў Віленскай, Віцебскай і Гродзенскай губернях адносныя лічбы былі блізкія да сярэдніх, то ў Мінскай губ. колькасць судовых спраў павялічылася ў 4,8 раза (з 1 397 да 6 658), а ў Магілёўскай губ. — падвоілася (з 2 027 да 4 078). Пры гэтым дынаміка адміністрацыйных спраў, якія паступілі на вырашэнне губернскіх прысутнасцей, у Мінскай губ. амаль не змянілася за вызначаны перыяд (3 104 справы — у 1902 г. і 3 127 — у 1910 г.), а ў Магілёўскай нават скарацілася (з 745 да 616 адпаведна).

Аднак прыведзеныя даныя не ў поўнай ступені адлюстроўваюць аб'ём працы, якая праводзілася ў губернскіх прысутнасцях. Так, з 1900 г. яны неслі адказнасць за харчовае становішча ў вёсцы, што нельга ўлічыць колькасцю справаводства, а з 1906 г. пачалася рэалізацыя Сталыпінскай аграрнай рэформы.

---

26 РДГА. Ф. 1278. Воп. 2. Спр. 2057. Арк. 9–11.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

Работа неадменнага члена па падрыхтоўцы такога кшталту спраў, якія паступалі на разгляд прысутнасці, была, па словах міністра ўнутраных спраў М. А. Маклакова, «ничтожной долей той чисто организационной работы», якая стала часткай працы прысутнасцей пры рэалізацыі ўрадавай палітыкі[27].

**_Табліца 2_ — Колькасць спраў, якія паступілі ў губернскія прысутнасці (1902/1904 г. і 1910 г.)[28]**

| Губерні | Судовыя | | Адміністрацыйныя | | Па прымяненні ўказа 9 лістапада 1906 г. і закона 14 чэрвеня 1910 г. | | Усяго* | |
|---|---|---|---|---|---|---|---|---|
| | 1902/ 1904 г. | 1910 г. | 1902/ 1904 г. | 1910 г. | 190[illegible] г. | 1910 г. | 1902/ 1904 г. | 1910 г. |
| Віленская (1904) | 790 | 2816 | 33[illegible]4 | 85[illegible] | 9 | 243 | 4163 | 11589 |
| Віцебская (1902) | 1484 | 5675 | 92[illegible] | 1473 | 58 | 200 | 2467 | 7348 |
| Гродзенская (1904) | 1349 | 4901 | [illegible]39 | 1750 | 43 | 26 | 2831 | 6677 |
| Мінская (1902) | 1397 | 6[illegible]8 | 3104 | 3127 | 1 | 25 | 4502 | 9810 |
| Магілёўская (1902) | 202[illegible] | 4078 | 745 | 616 | 43 | 80 | 2815 | 4774 |
| Усяго ў 5 губернях | [illegible]047 | 2[illegible]28 | 9577 | 15496 | 154 | 574 | 16778 | 40198 |
| Усяго ў 43 губернях (189[illegible] г.) | 418[illegible] | 141516 | 49800 | 98296 | 6883 | 10779 | 98501 | 250591 |
| У сярэднім у адной губернскай прысутнасці ў 43 губернях (1893 г.) | 9[illegible]2,5 | 3291,1 | 1158,1 | 2286,0 | 160,1 | 250,7 | 2290,7 | 5827,7 |
| У сярэднім у адной губернскай прысутнасці ў 5 заходніх губернях | 1409,4 | 4825,6 | 1915,4 | 3099,2 | 30,8 | 114,8 | 3355,6 | 8039,6 |
| Суадносіны аб'ёму справаводства ў 5 заходніх і ў 43 губернях імперыі (%) | 144,9 | 146,6 | 165,4 | 135,6 | 19,2 | 45,8 | 146,5 | 138,0 |

***Заўвага.** Звесткі ў графе пералічаны, паколькі выніковыя лічбы (усяго) МУС і аўтара па некаторых радках адрозніваюцца.*

---

27 РДГА. Ф. 1278. Воп. 2. Спр. 2057. Арк. 3 адв. — 4.

28 Складзена і падлічана па: РДГА. Ф. 1278. Воп. 2. Спр. 2057. Арк. 9–11.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ

*4 сакавіка 1906 г.*,[29] дзеля аказання дапамогі Сялянскаму зямельнаму банку ў мэтах выканання *Маніфеста ад 3 лістапада 1905 г.*[30] па палягчэнні набыцця сялянамі зямлі, ствараліся павятовыя і губернскія землеўладкавальныя камісіі. У склад апошніх у якасці члена ўваходзіў таксама і неадменны член губернскай прысутнасці, таму што менавіта гэтымі чыноўнікамі ажыццяўлялася агульнае кіраўніцтва землеўладкаваннем ў губерні. Новае кола абавязкаў значна ўскладніла дзейнасць апошніх, якія павінны былі кіраваць справаводствам і падрыхтоўкай справаздач па землеўладкаванні. Пры гэтым у Віленскай і Гродзенскай губернях губернскія землеўладкавальныя камісіі не былі створаны, а іх функцыі выконвалі губернскія прысутнасці[31]. Таму ў 1908 г. для выканання абавязкаў неадменнага члена Віленскай губернскай прысутнасці па справах землеўладкавання быў прызначаны чыноўнік асобых даручэнняў Галоўнага ўпраўлення землеўладкавання і земляробства. З гэтага часу землеўладкавальнае справаводства было выдзелена ў асобнае. Віленская і Гродзенская губернскія землеўладкавальныя камісіі адкрыліся толькі пасля выдання закона ад 29 мая 1911 г.[32].

Рэалізацыя аграрнай палітыкі ўрада напрамую залежыла ад паспяховасці працы ўсіх структурных элементаў мясцовага кіравання, у тым ліку губернскіх прысутнасцей і іх неадменных членаў. Яны кантралявалі дзейнасць земскіх начальнікаў, праводзілі інструктаж апошніх адносна новых заканадаўчых актаў у дачыненні да сялянскага землеўладання і ўвогуле па выкананні разнастайных абавязкаў. Міністр унутраных спраў М. А. Маклакоў лічыў, што ад асабовага складу неадменных членаў губернскіх прысутнасцей залежыць паспяховасць

---

29 ПЗСРИ. Собр. 3-е. Т. 26 (1906). № 27478. – С. 199–201.

30 ПЗСРИ. Собр. 3-е. Т. 25 (1905). № 26871. – С. 790.

31 Комитет по землеустроительным делам. Краткий очерк за десятилетие: 1906–1916. – Петроград, 1916. – С. 11.

32 НДБ РДГА. ДЗ 14926. – С. 25.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

рэалізацыі не толькі аграрных, але і ўсіх рэформ мясцовага кіравання[33].

У губернскую прысутнасць паступалі на разгляд ці зацвярджэнне толькі тыя справы, якія выклікалі цяжкасці пры вырашэнні і ў якіх часцей за ўсё аспрэчваліся пастановы земскіх начальнікаў ці іх павятовых з'ездаў. У табл. 2 прыведзены дадзеныя аб колькасці спраў, якія паступілі ў губернскія прысутнасці па рэалізацыі ўказа ад 9 лістапада 1906 г. і закона ад 14 чэрвеня 1910 г.[34] Невялікі аб'ём у 1906 г. сведчыць аб тым, што, па-першае, яшчэ не ўсе ведалі аб новых заканадаўчых актах, па-другое, у рэгіёне пераважала падворнае надзяленне зямлёй у адпаведнасці з Мясцовым палажэннем ад 19 лютага 1861 г. для Віленскай, Гродзенскай, Мінскай губерняў і часткі Віцебскай губ. Але і ў Магілёўскай і Віцебскай губернскіх прысутнасцях, дзе было абшчыннае землекарыстанне, колькасць спраў па ўказе ад 9 лістапада 1906 г. была значна меншай, чым у сярэднім па 43 губернях імперыі: у Магілёўскай у 3,7 раза, у Віцебскай – у 2,8 раза, а ў цэлым па 5 беларускіх губернях – у 5,2 раза. Але гэта не сведчыць аб непаспяховасці рэалізацыі ўрадавых мерапрыемстваў. Прычынай было тое, што на першым этапе пры падворным землекарыстанні сяляне бралі дакументы, якія проста пацвярджалі ўладанне надзеламі ў земскіх начальнікаў ці валасных праўленнях, не звяртаючыся да губернскіх прысутнасцей. Праблемы маглі ўзнікаць пры правядзенні землеўладкавання – адвядзенні надзелаў да аднаго месца пры пераходзе да водрубаў ці хутароў. Пры абшчынным жа карыстанні становішча было больш складаным. Але і тут на разгляд губернскай прысутнасці паступалі толькі абскарджаныя пастановы павятовых з'ездаў земскіх начальнікаў ці павятовых землеўладкавальных камісій (у тых мясцовасцях,

---

[33] РДГА. Ф. 1278. Воп. 6. Спр. 456. Арк. 19–19 адв.

[34] ПСЗРИ. Собр. 3-е. Т. 30 (1910). Отд. I. № 33743. – С. 746–753.

дзе не было губернскіх землеўладкавальных камісій). Таму невыпадкова, што ў губернскія прысутнасці 5 беларускіх губерняў, у параўнанні з сярэднімі данымі па 43 губернях імперыі, паступіла ў 2,2 разы менш спраў па законе ад 14 чэрвеня 1910 г. (табл. 2). Гэта сведчыць аб паспяховасці работы на ўзроўні ўчасткаў земскіх начальнікаў і іх павятовых з'ездаў, а таксама павятовых і губернскіх землеўладкавальных камісій.

Дарэчы, Магілёўская і Віцебская губерні, па даных Земскага аддзела МУС, адносіліся да ліку перадавых у справе рэалізацыі Сталыпінскай рэформы. Да 1 лістапада 1908 г. па колькасці задаволеных заяў аб выхадзе з абшчыны на першым месцы была Калужская губ., дзе зямля была замацавана за 76,06 % гаспадароў двароў, якія падалі заявы. Магілёўская губ. была на чацвёртым месцы сярод 40 губерняў Еўрапейскай часткі імперыі (65,82 %), а Віцебская – на шостым (65,07 %), а найменшая колькасць заяў была задаволена ў Вяцкай губ. — 16,35 %[35]. У гэты час у Віцебскай губ. было пададзена 11 953 заяў аб выхадзе з абшчыны, 7 778 гаспадароў замацавалі 56 238 дзес. (па 7,23 дзес.) надзельнай зямлі. У Магілёўскай губ. да 1 лістапада 1908 г. было пададзена 30 701 заява аб выхадзе з абшчыны, 20 207 гаспадароў замацавалі 164 160 дзес. (па 8,12 дзес.) надзельнай зямлі. Пры гэтым у сярэднім у кожнай з 40 губерняў Еўрапейскай Расіі да 1 лістапада 1908 г. было пададзена 71 839 заяў аб выхадзе з абшчыны, 10 401 гаспадароў замацавалі 80 319 дзес. (па 7,72 дзес.) зямлі[36]. Такім чынам, ужо ў першыя гады з пачатку рэалізацыі Сталыпінскай рэформы губернскія прысутнасці Беларусі дасягнулі значных поспехаў у рэалізацыі аграрнай палітыкі ўрада.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

[35] Приложения к трудам съезда непременных членов губернских присутствий и землеустроительных комиссий. 10–23 января 1909 г. — Санкт-Петербург, 1909. — С. 130, 134.

[36] Приложения к трудам съезда непременных членов губернских присутствий и землеустроительных комиссий. 10–23 января 1909 г. — С. 135.

Да таго ж, у адпаведнасці з цыркулярам МУС ад 23 студзеня 1908 г. № 10, неадменныя члены губернскіх прысутнасцей прыцягваліся да ўзмоцненай рэвізійнай дзейнасці. У адпаведнасці з асаблівымі планамі рэвізій, распрацаванымі губернскімі прысутнасцямі, у кожнай губерні рэвізаваліся не менш за палову агульнага складу земскіх начальнікаў і павятовых з'ездаў. Вынікі рэвізій і справаздачы па іх абавязкова заслухоўваліся на пасяджэннях губернскай прысутнасці, а затым ў копіях накіроўваліся ў Земскі аддзел МУС[37]. Так, неадменны член Гродзенскай прысутнасці Л. Г. Баркоў у 1908 г. рэвізаваў 4-ы земскі участак Пружанскага павета, якім кіраваў кандыдат на гэтую пасаду, князь Гагарын. Рэвізія выясветліла ў справаводстве значныя залежи папер. Так, у студзені 1908 г. паступіла 148 чыншавых спраў аб прызнанні чыншавых правоў. Па некаторых з іх патрабавалася складанне планаў зямельных надзелаў, але землямера на гэтым участку не было, толькі ў суседнім. Па астатніх справах неабходна было толькі правесці дазнанне. Пры гэтым справы ляжалі ў павятовай па чыншавых справах прысутнасці з 1887 г. Сітуацыя ўскладнялася тым, што за 1907 г. на ўчастку змяніліся 3 земскія начальнікі[38]. Новаму земскаму начальніку на пасяджэнні прысутнасці было рэкамендавана больш увагі надаць менавіта больш хуткаму вырашэнню спраў і ліквідацыі пакладаў («залежей») ад былых гадоў.

Дзеля высвятлення стану спраў і выніковасці дзейнасці мясцовых устаноў у губерні з рэвізіямі камандзіраваліся чыноўнікі Земскага аддзела Міністэрства ўнутраных спраў. Так, у 1909 г. у Віленскую губ. быў накіраваны К. К. Сцефановіч. Адзначым, што ён быў добра знаёмы з жыццём у заходніх губернях, таму што ў 90-я гг. XIX ст. з'яўляўся Бабруйскім павятовым прадвадзіцелем дваранства і нават напісаў нарыс «О сельском и волостном управлении в Западном крае», у якім сцвярджаў

[37] РДГА. Ф. 1278. Воп. 2. Спр. 2057. Арк. 3 адв. — 4.

[38] РДГА. Ф. 1291. Воп. 31, 1908 г. Спр. 45. Арк. 95–96 адв.

РЕПОЗИТОРИЙ БГПУ

неабходнасць распаўсюджання заканадаўства 1889 г. на заходнія губерні імперыі.[39] Віленскую губернскую прысутнасць К. К. Сцефановіч назваў «добродушной» за мяккае стаўленне да земскіх начальнікаў і сярод недахопаў адзначыў, што тут доўгі час чакалі вырашэння справы па пазямельным уладкаванні сялян і адмежаванні сервітутаў, некаторыя з якіх з 1899 да 1909 г. так і не былі вырашаны. Пры гэтым у прысутнасці «падрыхтаваліся» да прыезду рэвізора — на адным з пасяджэнняў было разгледжана «350 [падкрэслена К. К. Сцефановічам. — С. Т.] ... дел, ... наделали упущений, не писали никаких мотивов, заполнили резолюции, имея пустые бланки, так что нельзя даже установить, кто был на заседаниях»[40].

Сістэма штогадовых рэвізій усіх сялянскіх устаноў мела мэтай кіраўніцтва і больш правільнае накіраванне іх дзейнасці. Як адзначаў сучаснік падзей, неадменны член Віцебскай губернскай прысутнасці А. В. Арапаў, дзейнасць Віцебскай губернскай прысутнасці аб'яднала мясцовыя ўстановы і «поставила все крестьянское дело на должную высоту», і, па яго меркаванні, з кожным годам назіралася ўсё менш колькасць недакладнасцей і памылак у дзейнасці службовых асоб і устаноў, а адзінкавыя злоўжыванні не заставаліся без увагі і, пры неабходнасці, пакарання[41].

Такім чынам, з часу рэфармавання сістэмы мясцовых устаноў на тэрыторыі Беларусі дзейнасць губернскіх прысутнасцей, якія неслі адказнасць за рэалізацыю ўрадавай аграрнай палітыкі, паступова ўскладнялася і дапаўнялася ў сувязі з выданнем новых указаў і законаў, звязаных з правядзеннем Сталыпінскай аграранай рэформы.

---

39 *Стефанович, К. К.* О сельском и волостном управлении в Западном крае / К. К. Стефанович. — Санкт-Петербург, 1895.

40 РДГА. Ф. 1291. Воп. 122, 1909 г. Спр. 38. Арк. 21–21 адв.

41 *Арапов, А. В.* Краткий исторический очерк крестьянского вопроса и деятельности крестьянских учреждений Витебской губернии со дня обнародования высочайшего манифеста 19-го февраля 1861 года и до наших дней: (50-летие) / А. В. Арапов. — Витебск, 1911. — С. 57–58.

РЭПАЗІТОРЫЙ БДПУ